*УДК 393(476-37Светлагорск)*

**В. А. Краўчанка**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ПАХАВАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ СВЕТЛАГОРШЧЫНЫ: МЯСЦОВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

*У артыкуле, прысвечаным пахавальнай абраднасці аднаго з раёнаў Гомельскай вобласці – Светлагорскага, разглядаюцца пахавальныя абрады, звычаі і звязаныя з імі прыкметы і павер'і. У артыкуле выкарыстаны палявыя экспедыцыйныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў архіве навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі ГДУ імя Францыска Скарыны.*

Светлагорскі раён – адзін з раёнаў Гомельскай вобласці, у якім не толькі захоўваюцца агульнанародныя традыцыі пахавання, але і маюць месца адметныя асаблівасці пахавальных абрадаў и звычаяў. Звесткі, якія былі запісаны ў палявых экспедыцыях ад жыхароў розных вёсак Светлагорскага раёна, пацвярджаюць устойлівасць захавання і спецыфічны характар пахавальнай абраднасці і звязаных з ёй прыкмет і павер'яў. "Грунтуюцца яны на веры ў замагільнае жыццё, на сувязь памёршага з сям'ёй, на магчымасць нябачнага прыходу душы нябожчыка, які, паводле павер'яў, можа дапамагаць або шкодзіць жывым" [1, 260].

Калі чалавек паміраў, у доме спынялі гадзіннікі, запальвалі свечку, закрывалі тэлевізар, вокны, люстэркі, "*каб пакойнік не відзеў сам сябе*" (запісана ў в. Чкалава ад Закружнай Валянціны Іванаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Залатуха Калінкавіцкага р-на,) студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.). Нябожчыка абавязкова трэба было памыць, апрануць. Як правіла, яшчэ пры жыцці было падрыхтавана такое адзенне. Мыць яго павінны былі людзі таго ж полу: мужчын мылі мужчыны, жанчын – жанчыны, прычым запрашалі мыць нябожчыка чужых людзей, напрыклад, суседзяў: "*Калі мылі нябожчыка, то звалі саседзей, еслі жанчына памірае, то звалі жанчыну, а еслі мужчына, то звалі мужчыну*" (запісана ў в. Чыркавічы ад Сівак Ніны Пятроўны, 1934 г. н., Гарэлік Праскоўі Несцераўны, 1929 г. н., студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.). Было прынята ў мясцовых традыцыях даваць падарунак тым, хто ўдзельнічаў у рытуале абмывання, за гэта ім давалі хустку або ручнік. У некаторых вёсках мыць нябожчыка павінны былі людзі сталага ўзросту: "*Звалі старэйшых. Вот, напрымер, мужчына памрэ, значыць, мужчын два-тры чалавекі*" (запісана ў в. Баравікі ад

Сцепанцовай Марыі Сяргееўны, 1949 г. н., студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К.); “*Мужчына мужчыну мыў, а жэншчына – жэншчыну. Старыя, якія ўжо нязмоглыя, нездаляшчыя*” (запісана ў в. Рудня ад Шумавай Марыі Арсеньеўны, 1934 г. н., Шумава Уладзіміра Уладзіслававіча, 1964 г. н., Караткевіч Галіны Кірылаўны, 1941 г. н. (раней пражывала ў в. Шчытная Жлобінскага р-на), студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К). Пасля абмывання ваду вылівалі або каля вугла хаты, дзе не ходзяць людзі, або на вуліцы з таго боку хаты, дзе знаходзіцца чырвоны кут: “*Воду тую, у якой яго мылі, абязацельна надо, вот дзе ў вас ікона ў хаце, на кут выліць, на дварэ, на кут і ўсё*” (запісана ў в. Чкалава ад Закружнай Валянціны Іванаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Залатуха Калінкавіцкага р-на,) студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.).

Цікавымі мясцовымі рысамі вылучаўся рытуал прыбірання нябожчыка ў вёсцы Чыркавічы (аграгарадок зараз): памерламу “звязвалі бараду”: “*Ну, нада бараду звязаць, калі чалавек памёр*” (запісана ў в. Чыркавічы ад Сівак Ніны Пятроўны, 1934 г. н., Гарэлік Праскоўі Несцераўны, 1929 г. н., студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.). На тое месца, дзе павінна была стаяць труна з нябожчыкам, кідалі капейкі, каб “*закупіць месца*” (запісана ў в. Баравікі ад Сцепанцовай Марыі Сяргееўны, 1949 г. н., студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К.). Нельга было іншым людзям насіць тое адзенне, у якім чалавек памёр: лічылася, што можно моцна захварэць, калі праігнараваць гэту забарону.

Звычайна пахаванне ладзілі зранку ці ў абед, на наступны дзень пасля смерці, таму што людзі верылі, што калі хаваць памерлага ў другой палове дня, то “*скора пакойнік зноў у хаце будзе*” (запісана ў в. Краснаўка ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г. н. (прыехала з г. Вялікі Усцюг РФ), студэнткай Горскай Т. (2006 г.)). Ноччу над нябожчыкам чыталі малітвы, галасілі. У некаторых вёсках на галашэнне запрашалі спецыяльных жанчын, “*галасух*”, у некаторых – нябожчыка аплаквалі толькі “*свае*”: “*Ёсць галасухі спецыяльныя, а ў нас не было. Як памрэ чалавек, дак свае плачуць*” (запісана ў в. Рудня ад Шумавай Марыі Арсеньеўны, 1934 г. н., Шумава Уладзіміра Уладзіслававіча, 1964 г. н., Караткевіч Галіны Кірылаўны, 1941 г. н. (раней пражывала ў в. Шчытная Жлобінскага р-на), студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К). Лічылася, што па нябожчыку нельга было доўга і многа плакаць, бо «там» (на тым свеце) яму будзе цяжка. У горадзе Светлагорску, напрыклад, людзі, якія збіраліся правесці памерлага ў апошні шлях , выказвалі свае меркаванні пра яго: “*Калі чалавек памёр, то ўсе высказываюць свае мненія*” (запісана ў г. Светлагорску ад Цітовай Евы Іванаўны, 1941 г. н. (раней пражывала ў Татарстане), студэнткамі Даніленка В., Музычэнка Т., Рашоевай Т.).

У труну нябожчыку клалі розныя рэчы. Так, у вёсцы Баравікі клалі сена, прасціну і падушку, а “з сабой” – нічога: “*Колісь у гроб паложаць сена, заслалі прастынёй і падушачку. З сабой нічога не клалі*” (*запісана ў в. Баравікі ад Гайдук Любові Тарасаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Еланы Светлагорскага р-на), студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К.).* “*З сабой на той свет*” *памерлым клалі адзенне: гэта маглі быць рубашкі, штаны, майткі. Існавала павер'е, что нябожчык можа прыходзіць у снах і прасіць «даць яму на той свет» тое, што яму «там” трэба. У такім выпадку людзі закопвалі гэтыя рэчы каля магілы: «Наклала, а штаноў забылася, рэмня забыліся заплікнуць яму. А ён тады сніцца: “Дзе мой рэмень?” Дак я эты рэмень скруціла, да пашла, да на магілу. Выкапала ямачку, закапала рэмень. І штаны…»*” (запісана ў в. Рудня ад Рудніцкай Марыі Рыгораўны, 1927 г. н., студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К.). У некаторых вёсках у труну клалі гадзіннік, шапку, а свечку клалі ў рукі нябожчыка, а на грудзі – абраз. Тым, хто ў жыцці смаліў, маглі пакласці папіросы і махорку.

Значнае месца ў пахавальнай абраднасці надавалася вынасу труны з хаты на могілкі. З гэтым працэсам у людзей было звязана шмат прыкмет і павер'яў. У некаторых вёсках традыцыйна труну выносіла радня, а ў іншых – чужыя: “*Выносілі труну ўся радня, маладыя хлопцы, і неслі да перакростка*” (запісана ў в. Мядзведаў ад Лапусты Ганны Адамаўны, 1943 г. н. (раней пражывала ў Хойніцкім р-не), студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.); “*Ну, чужыя людзі выносілі гроб*” (Запісана ў в. Чкалава ад Закружнай Валянціны Іванаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Залатуха Калінкавіцкага р-на,) студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.). Калі выносілі труну, памерламу звязвалі рукі і ногі, а развязвалі, калі ўжо прыносілі на могілкі, потым гэтыя завязкі кідалі ў магілу або клалі ў труну каля ног нябожчыка: “*Рукі звязвалі і ногі звязвалі, кагда на кладбішчэ завязеш, нада развязаць рукі і ногі. Да, пакуль вязеш, яны звязаны, і туды ў магілу кінуць завязкі*” (*запісана ў в. Чыркавічы ад Сівак Ніны Пятроўны, 1934 г. н., Гарэлік Праскоўі Несцераўны, 1929 г. н., студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.)*. Людзі пільнавалі за тым, каб гэтыя завязкі ніхто не ўкраў, бо, як лічылася, “там” чалавеку будзе дрэнна: “*Вот і е такіе, кажуць, знахары, якія воруюць гэтыя трапачкі і, кажуць, тады вельмі плоха чалавеку дзелаецца*” (запісана ў в. Чкалава ад Закружнай Валянціны Іванаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Залатуха Калінкавіцкага р-на,) студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.). У вёсцы Медзведаў труну выносілі да скрыжавання і ззаду пасыпалі жытам: “*Выносілі <…> і неслі да перакростка. Засыпалі жытам. Калі маладыя жэняцца, то засыпаюць упярод, а калі хароняць, узад*”

(запісана ў в. Мядзведаў ад Лапусты Ганны Адамаўны, 1943 г. н. (раней пражывала ў Хойніцкім р-не), студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.).

З пахавальнай абраднасцю як з адным з важным відам сямейна-абрадавага фальклору звязана шмат прыкмет і павер'яў. Напрыклад, лічылася, што, калі неслі труну, "*нельга было пераходзіць дарогу і ісці наперадзе*" (запісана ў г. Светлагорску ад Зіновіч Любові Іванаўны, 1954 г. н. (раней пражывала ў г. Добруш), студэнткамі Гусаковай Я., Цімашэнка А.). А ў вёсцы Краснаўка студэнтамі былі запісаны наступныя павер'і: "*Нельга насіць адзёжу, у якой чалавек памёр, бо сільна забалееш*"; "*Нельга чапаць пакойніка за ногі, бо многа ў хаце будзе пакойнікаў*" (запісана ў в. Краснаўка ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г. н. (прыехала з г. Вялікі Усцюг РФ), студэнткай Горскай Т. (2006 г.)). Акрамя гэтага, нельга было на сабе несці крышку труны: тады, лічылася, чалавек можа хутка памерці.

Перад пахаваннем у магілу кідалі капейкі, каб "закупіць месца": "*На кладбішчы ў магілу дзеньгі брасалі. Ну, гаварат, нада купіць землю. Гаварат, нада ж абязацельна капейкі брасаць*" (запісана ў в. Чкалава ад Закружнай Валянціны Іванаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Залатуха Калінкавіцкага р-на,) студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.). Потым асвячалі магілу святой вадой і хавалі памерлага: "*Свечанай вадой папырскаюць магілку і хаваюць. І плачуць, і галосяць па сваём, і прашчаюцца, і цалуюць, но ніхто нічога не сыпле*" (запісана ў в. Рудня ад Рудніцкай Марыі Рыгораўны, 1927 г. н., студэнткамі Анцімонік А., Бандурынай К.).

Паводле павер'яў, усіх, хто прысутнічаў на пахаванні, запрашалі на памінкі. Перад асноўнай ежай кожны павінен быў пакаштаваць лыжачку (або тры) салодкай стравы, якую называлі "*сыта*". Яна ўяўляе сабой салодкую воду з хлебам, саладзілі "*сыту*" цукрам або мёдам: "*Сладкае ставілі, салодзяць воду, хлеб туды крышаць. Называлася сыта*" (запісана ў в. Стракавічы ад Дземідовіч Ніны Іванаўны, 1930 г. н. (раней пражывала ў в. Славаня Светлагорскага р-на), студэнткамі Гусаковай Я., Цімашэнка А.). Пасля гэтага маглі падаваць боршч, прасяную кашу, маленькія булачкі і гарэлку. На стол сыпалі цукеркі: "*А пасля, як паабедаюць, і вадзічкі кругам дадуць запіць*" запісана ў в. Прыстарань ад Тунік Веры Іванаўны, 1936 г. н., студэнткамі Гусаковай Я., Цімашэнка А.). На помінках нельга было напівацца і сварыцца.

Памінаць нябожчыка збіраліся праз 9 і 40 дзён. Лічылася, што да саракавога дня душа чалавека яшчэ побач, а ў гэты дзень "*адлятае да Бога*": "*Пасля смерці праз 9 і 40 дзён таксама сабіраліся. Считалі, што ў гэты дзень душа да Бога адлятае*" (запісана ў в. Печышчы ад Кузьмянок Зінаіды Мікітаўны,1934 г. н., студэнткай Гайковай Ю. (2007 г.)). На памінках гучалі галашэнні, у якіх звярталіся да Бога, да памерлага, напрыклад: "*Устань, братка, скажы хоць славечка // Сваім*

*дзеткам, да ўсёй радні. // Ой, Божа ж мой, Божа!*” (запісана ў в. Чыркавічы ад Сівак Яўгенні Пятроўны, 1931 г. н., студэнткамі Малуха Л., Ярмоліч А.); “*Ой, пайду я на могілкі // Ды стану рыдаць // “Устань, устань, родна мамка, // Касу расчасаць. // А ўсе мае сяброўкі // Касу расчасалі, // А маю родну мамку // Зямля не пускае*” (запісана ў в. Печышчы ад Кузьмянок Зінаіды Мікітаўны,1934 г. н., студэнткай Гайковай Ю. (2007 г.).

Прыведзеныя матэрыялы па пахавальнай абраднасці Светлагорскага раёна сведчаць аб захаванасці ў лакальных традыцыях агульнаэтнічных элементаў і наяўнасці спецыфічных асаблівасцей.

**Спіс літаратуры**

1 Беларусы / рэдкал.: Бялявіна В. М. [і інш.] – Т. 7 : Вусная паэтычная творчасць. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 586 с.